# ЗАГАД

**ад 29 верасня 2008 г. № 76**

**Аб узнагароджанні нагрудным знакам Міністэрства культуры "За ўклад у развіццё культуры Беларусі"**

**УЗНАГАРОДЗІЦЬ:**

**нагрудным знакам Міністэрства культуры "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" за шматгадовую плённую працу, значны ўклад у справу адраджэння і захавання культуры Беларусі:**

**БЯСПАЛУЮ** Марыю Аркадзьеўну, прафесара кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў";

**ЯРОХА** Таццяну Анатольеўну, загадчыка аддзела даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання дзяржаўнай установы "Нацыянальная бібліятэка Беларусі";

**КЕЗІК** Валянціну Іванаўну, дырэктара Браслаўскага раённага дома культуры Віцебскай вобласці;

**КРАСОЎСКУЮ** Кацярыну Леанідаўну, дырэктара дзяржаўнай установы культуры "Палац культуры вобласці";

**КУДРАЎЦАВУ** Зою Мікалаеўну, намесніка дырэктара па выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце ўстановы адукацыі "Мінскае дзяржаўнае музычнае вучылішча імя М.І. Глінкі";

**КУРАКУЛАВА** Дзмітрыя Сяргеевіча, мастацкага кіраўніка групы сучаснай харэаграфіі "ТАД" дзяржаўнай установы культуры "Гродзенская абласная філармонія";

**ЛЕНКІНА** Аляксандра Адольфавіча, кінарэжысёра вышэйшай катэгорыі студыі мультыплікацыйных фільмаў рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм";

**ЛЯНКЕВІЧ** Таісію Леанідаўну, дырэктара дзяржаўнай установы "Мінскі абласны краязнаўчы музей";

**НЯЧАЕВУ** Галіну Рыгораўну, дырэктара ўстановы "Веткаўскі музей народнай творчасці" Гомельскай вобласці;

**ФІЛІПОВІЧ** Наталлю Іосіфаўну, вядучага навуковага супрацоўніка навукова-даследніцкай работы ўстановы "Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны";

**ШУСЦІКАВУ** Зою Іванаўну, дырэктара дзяржаўнай установы "Брэсцкая абласная філармонія".

**Міністр У.Ф. МАТВЕЙЧУК**

**Прэстыж прафесіі**

# Наперад — з інфармацыйнымі тэхналогіямі



## Таццяна ЯРОХА, загадчык аддзела даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:

— У любой сферы дзейнасці не абысціся сёння без кампетэнтнасці, шырокага
кругагляду і інавацыйнасці. Такія спецыялісты заўжды запатрабаваныя. Датычыцца гэ-
та і бібліятэчных работнікаў. Так, прэстыжнасць прафесіі вызначаецца цяпер і матэ-
рыяльнымі фактарамі, чым бібліятэкары ў большасці сваёй пакуль не надта могуць
пахваліцца. Але бібліятэчная справа рэспублікі няўхільна развіваецца, і я веру ў хуткія
змены да лепшага... Доказам таму — наша суперсучасная Нацыянальная бібліятэка.

Аддзел, дзе я працую, імкнецца выкарыстоўваць для абслугоўвання чы-
тачоў самыя сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Для наведвальнікаў у нас
існуе больш за сто баз даных айчыннай і сусветнай вытворчасці. Такая іна-
вацыйнасць не можа станоўча не ўплываць на грамадскую думку і забяс-
печвае Нацыянальнай бібліятэцы прэстыж самай сучаснай установы культу-
ры Беларусі.